Ігуменскі тракт

№ 40 (55)

■ Родныя тапонімы

Шаноўныя чытачы!

Мы распачалі рубрыку, прысвечаную паходжанню назваў беларускіх гарадоў, вёсак, мястэчак. Некаторыя з вас ужо даслалі свае запыты, просьбы патлумачыць назву сваёй малой радзімы. Хтосьці нават прапанаваў уласную версію паходжання назвы. Усё гэта мы будзем друкаваць на старонках «Звязды», у «Ігуменскім тракце». Нашым экспертам выступіць старшыня Нацыянальнай тапанімічнай камісіі пры Акадэміі навук Беларусі Ігар КАПЫЛОЎ.

Сёння мы змяшчаем ліст, які даслала Людміла Ардынская з Шаркаўшчынскага раёна, якая лічыць, што назва яе вёскі — гэта «Рай пані Дзюкі»:

Я цікаўлюся гістарычным мінулым свайго Шаркаўшчынскага краю. Таму хацелася даведацца паходжанне назвы Радзюкі. У вёсцы і наваколлі жывуць таксама людзі з прозвішчам Радзюк. Ведаю, што гэта прозвішча сустракаецца і ў іншых месцах Беларусі.

Хачу прапанаваць свае дзве версіі паходжання назвы вёскі. Першая — мая, паэтызаваная. Ад бабулі чула слова «радзець» у значэнні «старацца, дбаць, быць руплівым». Казалі: «Ну, ніколькі не радзее, жыве: пусці — павалюся, паднімі — устану» (пра нядбайнага гаспадара).

Падумалася: калісьці ў даўнія часы жыў на ўзлессі чалавек. Араў, скарадзіў, сеяў жыта, кідаў авёс у грязь, трымаў калоды пчол, хадзіў на звера.

Пад нівы ляды расчышчаў, ледзь днее,
Пшаніцу малаціў і апрацоўваў лён.
Казалі людзі: «Ён стараецца, радзее»,
Бо бачны быў ад дбайнай працы плён.
Ад ранку шчыраваў ён на сялібе,
Не шкадаваў ні ног, ні вузлаватых рук.
Не бачыў у ім, здаецца, ніхто хібаў.
І далі яму прозвішча Радзюк.
Ён будаваў жытло, цяпер ужо з сынамі,
З дубовага бярвення на вякі.
Іх людзі называлі Радзюкамі,
А вёску, што ўзнікла,— Радзюкі.

Можа, і мае дачыненне той руплівы і дбайны Радзюк да маёнтка Радзюкі на ўзбярэжжы Бярозаўкі, які ў 1825 годзе купіў у графоў Берастоўскіх прадстаўнік і пачынальнік знакамітага шляхецкага роду Бароўскіх, уладальнікаў герба «Ястрабец», Антон Бароўскі… Прадаўжальнікі роду Бароўскіх цяпер жывуць у Польшчы і маюць сваю версію паходжання назвы Радзюкі. Хутчэй за ўсё, гэта легенда. Прадстаўніца іх роду пані Дзюка (ад жаночага імя Ядзюнька), чароўная і прывабная, ператварыла радзіннае гняздо ў сапраўдны райскі куток: аранжарэі, экзатычныя расліны, цудоўны сад, алеі з бэзу, язміну.

Птушыны спеў у паркавых прысадах,
Альтанкі сярод бэзу і язміну.
У маёнтак запрашэнню былі рады,
І доўга ўсіх не пакідалі успаміны.
Прыемнай, дабрадзейнай была пані.
З маёнткаў Лонка, Мосары і Букі
Бароўскіх вотчына найпрыгажэйшаю
прызнана.

З ахвотай госці ехалі ў рай Дзюкі.

Сапраўды, па-польску гучыць Радзю́кі (націск падае на перадапошні склад). Магчыма, з цягам часу адбылося выпадзенне гука «й». Але гэта толькі версіі. Я і ўсе радзюкоўцы будзем чакаць адказу ад спецыяліста.

ТЛУМАЧЭННЕ НАШАГА ЭКСПЕРТА:

Кожнае беларускае паселішча мае непаўторны лёс і адметную гісторыю, цесна звязаную з сацыяльна-эканамічнай гісторыяй краіны. Кожная назва напоўнена глыбокім гістарычным сэнсам. Паселішча Радзюкі — не выключэнне. Яно адносіцца да ліку старажытных беларускіх населеных пунктаў. Назва вёскі з'яўляецца родавым найменнем і ў мінулым абазначала зямельны надзел і месца, дзе пасяліліся прадстаўнікі аднаго роду, пачынальнікам якога быў чалавек з іменем або прозвішчам Радзюк. Тое, што гэта родавая назва, пацвярджае і факт супадзення прозвішчаў жыхароў вёскі і яе назвы. Дарэчы, на тэрыторыі Беларусі налічваецца вялікая колькасць паселішчаў, назвы якіх супадаюць з прозвішчамі жыхароў. Такая з'ява шырока адзначалася і ў старажытных пісьмовых крыніцах, якія захавалі матэрыялы перапісу людзей з указаннем назвы вёскі, адкуль яны паходзяць. Так, у гісторыка-юрыдычных матэрыялах Віцебшчыны і Полаччыны 2-й паловы XVII стагоддзя даволі часта сустракаюцца тапонімы, у якіх форма множнага ліку абазначае назву калектыву па родавай мянушцы заснавальніка роду або першапасяленца.

Найменне Радзюкі паходзіць ад асабовага імя Радзюк, якое ўяўляе сабой гутарковую беларускую форму царкоўнага праваслаўнага імя Радзівон. Гэтая форма імені была надзвычай папулярная сярод беларусаў. Пацвярджэннем таму служыць папулярнасць прозвішча Радзюк і яго аднакаранёвых варыянтаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Прозвішчы Радзько, Радзькоў, Радзькін, Радзьковіч, Радзькоўскі, Радзюкевіч, Радзюль, Радзюн, Радзюш, Радзянка, Радкавец, Радкевіч, Радковіч, Радкоў, Радкоўскі адзначаюцца ў большасці раёнаў нашай краіны. Тапонімы з асновай Радзюк, Радзько сустракаюцца на Віцебшчыне (Шаркаўшчынскі, Бешанковіцкі, Полацкі, Лепельскі раёны), Гродзеншчыне (Навагрудскі, Воранаўскі, Астравецкі, Мастоўскі, Гродзенскі раёны), Міншчыне (Мядзельскі, Валожынскі, Салігорскі раёны), Брэстчыне (Камянецкі раён), Магілёўшчыне (Быхаўскі раён), Гомельшчыне (Хойніцкі, Петрыкаўскі, Акцябрскі раёны).

Акрамя навуковай думкі, мае поўнае права на існаванне ваша паэтычная версія паходжання назвы. Такія тлумачэнні звычайна з'яўляюцца ў людзей, улюбёных у свой край, у тых, хто імкнецца апаэтызаваць гісторыю родных мясцін. Слова *радети* адносіцца да ліку старажытных славянскіх слоў. Яно сустракалася (у форме *радити*) у агульнаўсходнеславянскай мове (XI стагоддзе) у значэнні «клапаціца». У гэтым жа значэнні дзеяслоў *радети* быў вядомы і ў старабеларускай мове ў XIV — XVIII стагоддзях. Па-свойму займальная легенда прадстаўнікоў роду Бароўскіх. Гэтая легенда, хоць і не мае пад сабой навуковых падстаў, але цікавая як факт народнай творчасці і можа выкарыстоўвацца на занятках у школе або ў краязнаўчай рабоце.

■ Выстава

Этнічныя прыкметы адзінства

Краіны, якія ўваходзілі ў склад Вялікага Княства Літоўскага, плячо ў плячо змагаліся супраць лютых ворагаў, разам аралі, сеялі і збіралі ўраджай: некалі яны былі адзіным цэлым. Часам жанілі адно з адным сваіх сыноў і дачок, вяселлі гулялі згодна з агульнымі традыцыямі. Бо межаў тады не было, усе народы (беларусы, літоўцы, украінцы, рускія, палякі, латышы, эстонцы-сету і многія іншыя) жылі як адна вялікая сям'я. Усё гэта яскрава можна ўявіць, убачыўшы шматлікія этнаграфічныя рэчы, прадстаўленыя на выставе «Белая Русь і яе суседзі», якая адкрылася ў Нацыянальным гістарычным музеі.

Нявесты з чатырох краін чакаюць жаніхоў.

Выстаўлена больш за 700 аўтэнтычных помнікаў традыцыйнай культуры. Напрыклад, можна ўбачыць, як калісьці ладзілі вяселле. Стаяць куфры з пасагам і посуд, з якога пілі і елі, балюючы, госці.

Надзвычай шмат тут прадстаўлена нацыянальнай вопраткі. Усё самаробнае, створанае рукамі майстрых, якія жылі стагоддзе ці больш таму. Адмысловы пакрой, тканіна, спосабы ўпрыгожвання, а таксама разуменне кожнага, як зрабіць так, каб было зручна. Параўноўваючы беларускі народны строй з адзеннем іншых народаў, пачынаеш бачыць і разумець, чым мы адметныя і ўнікальныя, а чым падобныя да сваіх суседзяў.

Музычная культура таксама не пакіне нікога абыякавым. Шматлікія дудкі, ражкі, жалейкі, чароткі, вабікі — які народ на чым іграў, здагадайцеся… З усяго вынікае, што любілі нашы продкі ў вольную часіну дастаць з-за пазухі такі інструмент ды зайграць нескладаную мелодыю. Ёсць і нашмат больш «магутныя» музычныя інструменты: вялізныя рогі, прыстасаваныя, відаць, да прыгожага меладычнага поклічу.

Гледзячы на рамесныя прадметы, можна толькі здзіўляцца, як жылі калісьці народы. Кавальства, дрэваапрацоўка, ганчарства — без гэтага людзям даўней абысціся было немагчыма, таму і рабілі ўсё з душой, надзейна — так, што і да нашага часу выдатна захавалася.

Народны строй прывабіць любога...

Рамесныя вырабы.

Абрусы ды іншыя тканыя рэчы, самыя розныя мадэлі намітак, вытанчаныя прыгожыя вяночкі… Ці не знайшла б і сучасная модніца, чым натхніцца тут?

Артэфакты з беларускіх зямель складаюць аснову выставы. Аднак і памежныя краіны прадстаўлены даволі багата. Прадметы прывезены з Расійскага этнаграфічнага музея, які лічыцца адным з найбуйнейшых этнаграфічных музеяў Еўропы. Таму выставу сапраўды можна назваць унікальнай. Так шмат усяго захавалася ў краіны-суседкі, усё апісана і сістэматызавана. Падаецца, скарыстаўшы вопыт Расіі, неабходна стварацъ і ўласны дзяржаўны этнаграфічны музей.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ,
фота аўтара

РЭЛІКВІІ ДАРАГАНАЎ ВЯРНУЛІСЯ НА РАДЗІМУ

Больш за 300 фамільных рэліквій Дараганаў у Асіповіцкі гісторыка-краязнаўчы музей перадаў нашчадак роду, які прыехаў са Швецыі.

Андрэй Дараган, які захоўваў сямейныя рэліквіі прадзеда Восіпа, ужо не раз бываў у Асіповічах і ў вёсцы Дараганава, якая атрымала назву ад гэтага вядомага дваранскага роду. На гэты раз ён таксама наведаў родныя мясціны, усклаў кветкі на магілы продкаў. Акрамя таго, прапанаваў асабіста зрабіць эскізы для размяшчэння калекцыі. Да канца 2014 года музей плануе адкрыць новую экспазіцыю з гэтымі каштоўнымі экспанатамі. Дырэктар музея Антаніна Сцяпанава расказвае:

— Для нашага музея гэта ўнікальная калекцыя, паколькі ў нас у фондах такіх рэчаў няма, а набыць іх мы наўрад ці змаглі б сабе калі-небудзь дазволіць. У ліку прывезеных рарытэтаў цудоўны набор пісьмовых прылад XIX стагоддзя, мэбля, сталовыя прыборы, цацкі і іншыя рэчы. Гэта калекцыя стане сапраўднай іскрынкай музейнай экспазіцыі. Яе паказам мы маем намер адкрываць экскурсіі па нашым музеі.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

■ Мясціны, знітаваныя з душой

У Лаўцах ажыла крыніца

Навагрудская зямля багатая на гістарычныя помнікі і падзеі. Акрамя мясцін, вядомых кожнаму беларусу, ёсць тут куточкі, у якіх мала хто бываў, аднак ад гэтага яны не губляюць сваёй таямнічай прывабнасці...

Недалёка ад Навагрудка раскінулася маленькая вёсачка Лаўцы. Некалі побач знаходзіўся фальварак Ізва Капачэўскі. Сёння ад яго захаваліся, напрыклад, векавыя таполі, якімі калісьці была абсаджана гэтая тэрыторыя. Ёсць і стары сад, у якім дрэвы растуць не звычайнымі радамі, а пэўнымі геаметрычнымі фігурамі. Праз усю тэрыторыю і аж да самай вёскі цягнуцца дзве алеі з таполяў, клёнаў і ясеняў, якія чаргуюцца ў пэўным парадку. Паміж алеямі — брукаваная дарога. Тут расце шмат дрэў, не характэрных для нашай мясцовасці. Гэта лістоўніцы і вастралістыя клёны, высаджаныя паўкругамі. Ва ўсім адчуваецца рука добрага гаспадара і колішняга ландшафнага дызайнера.

Ёсць тут і прыгожае возера, якое аблюбавалі лебедзі. Непадалёк сажалка, дно якой вымашчана каменнямі. Гэта таксама зроблена рукамі чалавека.

Побач працякае невялікая рачушка Ізаўка. Некаторыя мясцовыя жыхары сцвярджаюць, што некалі тут былі бабровыя запруды і вялася лоўля баброў. Магчыма, ад гэтага вёска і атрымала назву Лаўцы.

З будынкаў, на жаль, захавалася не многае: невялікая сядзіба і руіны канюшні.

Дакладных звестак аб гісторыі фальварка Ізва Капачэўскі адшукаць пакуль не ўдалося, але работа ў гэтым кірунку вядзецца настаўнікамі і вучнямі Пятрэвіцкага дзіцячага сада-школы, у якім створаны краязнаўчы музей. Са слоў старажылаў яны даведаліся, што да 1939 года ў гэтай мясцовасці былі паляўнічыя ўгоддзі. А на тэрыторыі фальварка стаяў прыгожы двухпавярховы маёнтак, у якім жылі леснікі са сваімі сем'ямі. У малым будынку жылі парабкі, якія вялі гаспадарку і даглядалі коней, на якіх леснікі аб'язджалі навакольныя лясы. Згадваюць яны і пра штучна зробленую сажалку з камяністым дном, у якой разводзілі рыбу. Ад маёнтка да сажалкі цякла крыніца, з якой бралі ваду. Непадалёку знаходзілася школа.

Пры савецкай уладзе ў маёнтку было фабрычна-заводскае вучылішча. У ім атрымлівалі рабочыя прафесіі юнакі і дзяўчаты з усяго раёна. У малым будынку размяшчаўся сельскі Савет. У гады Вялікай Айчыннай вайны маёнтак і канюшню спалілі. Засталіся толькі руіны і векавыя дрэвы, якія помняць гэтыя падзеі.

Жамчужынай гэтых таямнічых мясцін з'яўляецца крыніца, якой нядаўна далі другое жыццё валанцёры Пятрэвіцкага сада-школы пад кіраўніцтвам настаўніцы Наталлі Беразоўскай. Цяпер яна працуе над новым праектам «Другое жыццё крыніцы»:

— Ад старажылаў я даведалася, што на тэрыторыі старога фальварка раней была крыніца, з якой мясцовыя жыхары бралі чыстую ваду і якая падпітвала рачулку Ізаўку. У апошні час яна знікла. Мне вельмі захацелася ажывіць яе. На мой погляд, крыніца — гэта нешта жывое і сімвалічнае. Гэта нітачка, якая звязвае наша мінулае, сучаснасць і будучыню. Тым больш што месца, дзе яна цякла, вельмі прыгожае.

Дзякуючы намаганням настаўніцы і яе валанцёраў мару ўдалося спраўдзіць — крыніца ажыла і радуе сэрцы людзей. Цяпер кожны можа прыйсці сюды ў спякотны дзень і наталіць смагу чыстай крынічнай вадою. Пасядзець на лаўцы ў цені векавых дрэў, паслухаць спевы крынічкі, палюбавацца лебедзямі на возеры, акунуцца ў атмасферу былых часоў, уявіць, як паміж зялёных алей імчаць панскія скакуны, як па квітнеючым садзе прагульваюцца маладыя паненкі, як купаецца ў возеры дзятва...

Вольга ДУХОЎНІК,
студэнтка Інстытута журналістыкі БДУ

■ Радавод

ПАМЯЦЬ У АСОБАХ

Час стварыць «Народны архіў»

Генеалогія — адна з найцікавейшых галін гісторыі, бо адлюстроўвае час і падзеі праз асабістыя лёсы людзей, знакамітых і не вельмі.

Жыццё беларускага гісторыка, архівіста, археографа, краязнаўцы Зміцера Даўгялы — гэта шматпакутная гісторыя Беларусі пачатку XX стагоддзя. Праз яго жыццё прайшлі і ваенныя дзеянні Першай сусветнай, і рэвалюцыя, нацыянальны ўздым, палітычныя рэпрэсіі супраць беларускай інтэлігенцыі ў трыццатых гадах, высылка за межы Беларусі.

Такія імёны — наш гонар, памяць і агульная гісторыя. Аб сваім даследаванні радаводу Даўгялы з чытачамі «Звязды» падзяліўся кандыдат гістарычных навук Міхаіл ШУМЕЙКА:

Сям'я Даўгялаў. Ніжні рад *(злева направа)*: **жонка Алена Васільеўна, маці Вольга Аляксеўна, нявестка Клаўдзія (жонка сына Мікалая) з дачкой Ляляй на руках.**
Верхні рад *(злева направа)*: **сын Мікалай, дачка Вера, сам Зміцер.**
1924 г., Магілёў.

— Ад тых, хто носіць прозвішча Даўгяла, давялося неяк чуць, што яно ўвасходзіць да XIV стагоддзя і звязана з Ягелам (Ягайлам). Адсюль і відавочная сугучнасць гэтых прозвішчаў. Ці сапраўды гэта так, цяпер мы не вызначым.

З XVI стагоддзя гэта прозвішча зафіксавана ў адпаведных дакументах, якія захоўваюцца ў асабістым фондзе Зміцера Даўгялы ў аддзеле рукапісаў бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта. Па словах былой аспіранткі гістфака БДУ Вольгі Іванова, якая працавала з дакументамі Даўгялы ў красавіку 2007 года, фонд паступіў туды ў 1929-м ад нейкага Л. Бацянскага (хто ён такі, нам не ўдалося даведацца) і налічвае каля паўтысячы дакументаў XVI — XX стст. Большая іх частка адносіцца да роду Даўгялаў. Першы яго прадстаўнік, які згадваецца ў дакументах 1585 года,— Матэвуш Даўгяла.

Дакладная дата яго нараджэння Зміцера Даўгялы вядомая — гэта 20 кастрычніка 1868 года. Што ж тычыцца даты смерці, то гэта прыблізна 1941–1942 гг. У дасланым ім 26 лістапада 1941 года з месца высылкі (кішлак Пахта — Арал, Паўдзенны Казахстан) лісце на імя былога рэктара БДУ Уладзіміра Пічэты (які сам толькі ў 1935 годзе вярнуўся з высылкі ў Вятку — Варонеж) Даўгяла пісаў: «Я адчуваю сябе не вельмі. Але яшчэ тупаю. Больш часу праводжу ў ложку. Дрэнна з сэрцам. Дрэнна ўвогуле працуе арганізм. Пастаянна баліць галава». Далей Даўгяла дзякаваў Пічэту за дасланыя грошы, пісаў, што да яго збіраецца прыехаць жонка Алена, расказваў пра лёс сваіх сыноў і дачок…

Зміцер Даўгяла. 1937 г., унутраная турма Мінска.

У 2002 годзе я падрыхтаваў невялічкую, у паўтары сотні старонак кніжачку пад назвай «Архівіст і археограф Зміцер Іванавіч Даўгяла», якая была выдадзена мізэрным тыражом у 100 асобнікаў. Я працягваю займацца вывучэннем навуковай дзейнасці Даўгялы, бо мяне прываблівае асоба гэтага таленавітага чалавека, які шмат зрабіў для беларускага грамадства.

На радзіме, на жаль, была вельмі сціпла адзначана яго навуковая і грамадская дзейнасць. Гэта асабліва кідаецца ў вочы пры параўнанні з адзнакамі заслуг яго нашчадкаў, якія жылі ў Расіі, ва Украіне.

Няўжо пацвярджаецца выслоўе: «Няма пророка ў сваёй Айчыне»? Ці, як пісала мне ў сакавіку 2011 года ўнучка Зміцера Даўгялы Марыяна Смрчэк, якая жыве ў Санкт-Пецярбугу, спасылаючыся на вялікага рускага паэта, «мы лянотныя і нецікаўныя»?

Бацька І. Даўгяла. Не раней за 1902 г.

Я паспрабаваў устанавіць сувязі са сваякамі Зміцера Даўгялы. І гэта мне ўдалося дзякуючы падтрымцы калег, украінскіх архівістаў. Вялікую дапамогу мне аказала і працягвае аказваць вышэйзгаданая Марыяна Смрчэк. Дзякуючы ёй стала вядома пра старэйшага сына Зміцера Іванавіча — Мікалая, які быў прафесарам Данецкага медыцынскага інстытута, заснавальнікам і першым загадчыкам кафедры нармальнай анатоміі інстытута (цяпер Данецкага нацыянальнага медыцынскага ўніверсітэта імя Максіма Горкага). Яго імя носіць студэнцкае навуковае таварыства ўніверсітэта, а побач з кафедрай, якую стварыў Мікалай Даўгяла, змешчана мемарыяльная дошка ў яго гонар.

Падчас чарговай сустрэчы з Марыянай у красавіку гэтага года на гістфаку БДУ я атрымаў ад яе магчымасць зрабіць лічбавыя копіі арыгінальных фотаздымкаў Зміцера Даўгялы і яго родных; некаторыя з іх прапаную да ўвагі паважаных чытачоў «Звязды».

Падаецца, яны ўяўляюць своеасаблівы фоталетапіс славутага роду Даўгялаў і сведчаць пра тое, што ёсць яшчэ ў нашых асабістых архівах шмат чаго цікавага не толькі для гісторыі асобных сем'яў, роду, але і для гісторыі ўсёй краіны. Думаю, трэба пачаць захоўваць і папулярызаваць такія гістарычныя крыніцы.

Менавіта так, як у свой час рабіў Зміцер Даўгяла. Бо ён займаўся гэтым прафесійна, працуючы ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзяў архіварыусам Віцебскага архіва старажытных актаў, старшынёй Віленскай археаграфічнай камісіі, загадчыкам Магілёўскага губернскага архіва, вучоным сакратаром Археаграфічнай камісіі Інстытута беларускай культуры (Беларускай акадэміі навук).

Ці не прыйшоў ужо час зрабіць «Народны архіў», у які маглі б прымацца і там захоўвацца ўсялякія дакументы? І не толькі тыя, што абмежаваны рознымі тыповымі і ведамаснымі «пералікамі». Інакш потым давядзецца займацца «пошукамі страчанага». Сам Зміцер Даўгяла казаў пра гэта яшчэ ў 1927 годзе, выступаючы на 2-й нарадзе архіўных працаўнікоў Беларусі: «Добра было б іх [матэрыялы дарэвалюцыйных архіваў — М. Ш.] захоўваць на месцах, каб паступова і па меры магчымасцяў яны выкарыстоўваліся мясцовымі працаўнікамі-краязнаўцамі». Тым самым ён ініцыяваў мясцовую грамадскасць звярнуць увагу на тое, што ёсць побач, уключаючы ўласныя, няхай і дастаткова сціплыя, асабістыя «архівы». Я ўпэўнены, што ён ведаў тое, пра што гаварыў…

■ Народныя ўмельцы

«Саламяныя» ўрокі ад Ірыны Кухцінай

Жыхарка Быхава, член Саюза народных майстроў Беларусі Ірына Генадзьеўна КУХЦІНА вучыць дзяцей працаваць з саломкай у школе народных рамёстваў і мастацтваў.
Анатоль КЛЕШЧУК. Фота аўтара

Адказная за выпуск Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.